Грыцкевіч, А. Непахісная вера і моц духа / А. Грыцкевіч // Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). – 2024. – 7 чэрв. – С. 1.

## Непахісная вера і моц духа

### Шлях да святасці ксяндза Мечыслава БАГАТКЕВІЧА пралягаў праз Верхнядзвінск

У гэтым годзе ў літургічным календары Віцебскай дыяцэзіі 12 чэрвеня абвешчана Днём успаміну благаслаўлёных святароў-мучанікаў Мечыслава Багаткевіча, Уладзіслава Мацьковяка, Станіслава Пыртака, Юрыя Кашыры і Антонія Ляшчэвіча. Імёны двух апошніх узгаданых айцоў-марыянаў добра вядомыя жыхарам Верхнядзвіншчыны. Двойчы ў год, у лютым і жніўні, мы ўрачыста ўшаноўваем памяць гэтых мучанікаў, у нашай маляўнічай Росіцы. А вось асобы трох іншых благаслаўлёных мучанікаў, у тым ліку ксяндза Мечыслава Багаткевіча, знаходзяцца ў своеасаблівым цені нашай малітоўнай памяці.



Шлях да хвалы Алтара святара-мучаніка Мечыслава Багаткевіча пралягаў па нашай беларускай зямлі. Ён нарадзіўся і выхоўваўся ў розных сацыяльных умовах, меў свой досвед дзяцінства і ранніх юнацкіх гадоў, але атрымаў найважнейшае, што можа мець чалавек – святасць. Звяртаючыся да гісторыі жыцця гэтага ксяндза, мы знаходзім добра знаёмыя нам назвы гарадоў і вёсак, імёны людзей, пра якіх калісьці ўжо даводзілася чуць. Вельмі важна зразумець, што ўсё гэта не проста кропкі на біяграфічнай лініі чалавека, якога мы сёння называем благаслаўлёным. Гэта своеасаблівае асяроддзе, у якім нараджалася ягоная святасць, развівалася і мацнела, каб потым у страшнай сутычцы з сілаю зла і смерці даць цудоўны плён.

Адметна, што ксёндз Мечыслаў у перыяд з 1 снежня 1941 года да 16 студзеня 1942 года служыў пробашчам у Дрысе (тагачасным Верхнядзвінску). Так ён апісвае пачатак свайго душпастырства ў лісце да арцыбіскупа Рамуальда Ялбжыкоўскага: «У Дрысе я знаходжуся з 1 снежня. Меў шмат цяжкасцяў, і мяне ўлады ледзь не выгналі адсюль, але я не паддаўся адчаю, падыйшоў з іншага боку і, пераадолеўшы цяжкасці, мне ўдалося атрымаць усё, што ад мяне патрабавалі. Мясцовыя людзі выпрасілі ўсе дакументы, патрэбныя мне для знаходжання ў гэтым месцы. Працы шмат, і праца такая прыемная, людзі – святыя, святара носяць на руках. Вельмі дзякуюць арцыпастыру за апеку, што даў ім святара».

Служба ў Верхнядзвінскай парафіі, на жаль, была вельмі кароткай: крыху больш года. Але памяць пра гэтага ахвярнага святара засталася ў сэрцах людзей на доўгія часы. Так успамінае кс. Мечыслава парафіянка Тэрэза Мастальска-Чвейчак: «Ксёндз спяваў з намі калядкі і жартаўлівыя беларускія песні, папулярную «Лявоніху» пра цешчу і зяця. Ён меў прыгожы голас і дасканалы слых. Калі ён служыў ля алтара, прэфацыя гучала амаль як арыя «Ite Missa est». Ён прамаўляў змястоўныя і жывыя казанні, часам патрыятычныя, змушаючы розумы слухачоў задумвацца і разважаць. Бывала, сыпаў «перуны і маланкі» на самыя горшыя праявы жыцця сваіх парафіянаў. Не было паблажак, дрыжэлі віноўнікі, а нам здавалася, што і муры касцёла трасуцца».

Калі звярнуцца да біяграфіі благаслаўлёнага Мечыслава Багаткевіча, то заўважым, што ксёндз пражыў усяго 38 год, 9 з якіх прайшло ў святарскім служэнні. Нарадзіўся 1 студзеня 1904 года ў вёсцы Крыкалы каля Дунілавіч (тагачаснае Віленскае Ваяводства, зараз Пастаўскі раён). Быў ахрышчаны ў касцёле ў Дунілавічах. Пасля заканчэння базавай школы ў Сітцах каля Параф'янава вучыўся ў гімназіі ў Будславе, Докшыцах, Навагрудку.

*Як нараджаецца святасць? Дзе яе вытокі і якім чынам яе заслугоўваюць людзі? Як становяцца святымі і калі? Як піша кс. Вячаслаў Пялінак MIC у сваёй працы «Росіцкія мучанікі»: «Не здараецца такое ў адзін дзень, і нельга дасягнуць святасці адным учынкам. Акалічнасці, у*

*якіх яна нараджаецца, бываюць самыя розныя – ад выканання звычайных абавязкаў да цяжкіх выпрабаванняў і лютых мучэнняў. Каб спазнаць гэтую таямніцу надпрыроднасці і стаць яе ўдзельнікам, трэба прайсці доўгі шлях, што пачынаецца ў кожнага чалавека з матчынай калыскі і вядзе праз самыя розныя падзеі да Невымоўнага і Таямнічага Божага Дару, якім і ёсць святасць.».*

Затым паступіў у Вышэйшую Духоўную Семінарыю імя святога Тамаша Аквінскага ў Пінску і, прайшоўшы духоўную фармацыю, 23 ліпеня 1933 года атрымаў святарскае пасвячэнне з рук біскупа Казіміра Букрабы. Распачаў працу ў Драгічыне над Бугам у якасці выхавацеля моладзі ў Духоўнай семінарыі. У перыяд з 1935 па 1939 гг. быў прэфектам гімназіі ў Лунінцы. Пасля пачатку Другой Сусветнай вайны ў верасні 1939 г. пераехаў да свайго малодшага брата ксяндза Станіслава Багаткевіча, пробашча ў Пушках каля Браслава. У хуткім часе распачаў служэнне ў суседняй парафіі Пеліканы і працягваў яго да восені 1941 года. У канцы лістапада 1941 года пераехаў у Дрысу.

Дрыса на той час ужо больш за 20 год знаходзілася пад уладай атэістычнай савецкай сістэмы. Але гады антырэлігійнага ўціску не знішчылі веры ў сэрцах людзей, таму яны з радасцю і натхненнем прывіталі кс. Багаткевіча. Ён з вялікім запалам узяўся за аднаўленне парафіяльнага жыцця, але гэтая праца не падабалася акупацыйным фашысцкім уладам. Гестапа выдала загад на арышт, аб чым кс. Мечыслава тайна папярэдзілі айцы-марыяне з Друі. Аднак ён не зрабіў ніякіх спробаў, каб уцячы і ўратаваць сваё жыццё, а надалей заставаўся з людзьмі і выконваў сваю святарскую паслугу. 16 студзеня 1942 года быў арыштаваны і вывезены ў турму ў Браслаў, а потым у Глыбокае. Вечарам 2 сакавіка кс. Мечыслава Багаткевіча разам з кс. Уладзіславам Мацьковякам і Станіславам Пырткам змясцілі ў камеру смяротнікаў. Уначы перад экзекуцыяй святары паспавядаліся адзін у аднаго і ў сваіх святарскіх малітоўніках-брэвіярыях напісалі апошнія развітальныя словы.

Вось частка развітальнага пісьма ксяндза Мечыслава Багаткевіча: *«У гэтую ноч ідзем на смерць я і мае браты ў святарстве з Іказні. Іду спакойна і маю надзею на Бога, што мае цярпенні і мая кроў заслужаць мне збаўленне. Відаць, такая воля Божая, бо я мог уцячы з Дрысы, таксама і адсюль, але баяўся, каб не парушыць Божых намераў і каб пазней пры смерці не мець дакораў сумлення. Ад усяго сэрца я прабачаю ўсіх маіх ворагаў, хацелася б для іх выслужыць неба. Маім сябрам у пеліканскай і дрысенскай парафіях перадаю сардэчнае прывітанне і прашу аб малітве.»*

На світанні 4 сакавіка 1942 г. ксяндзы Мечыслаў Багаткевіч, Станіслаў Пыртак і Уладзіслаў Мацьковяк былі вывезены ў лес каля вёскі Барок і расстраляны.

13 чэрвеня 1999 года падчас урачыстай святой Імшы ў Варшаве папа Ян Павел II абвясціў благаслаўлёнымі 108 мучанікаў. Сярод іх 12 чалавек, якія сваім пабожным жыццём, служэннем Богу і людзям, а таксама мучаніцкай смерцю за веру былі звязаныя з Беларуссю. Адзін з іх – благаслаўлёны святар-мучанік Мечыслаў Багаткевіч.

Памяць пра самаадданую службу гэтага ксяндза Богу і Касцёлу, а таксама пра непахісную веру і моц духа перад аблічча смерці жыве сярод беларускіх католікаў і да гэтага часу. Таму ў Верхнядзвінскай парафіі са згоды ардынарыя Віцебскай дыяцэзіі Алега Буткевіча з гэтага года нараджаецца традыцыя ўшаноўваць благаслаўлёнага мучаніка ксяндза Мечыслава Багаткевіча ў нашым касцёле. Сёлета дата мае асаблівае значэнне: спаўняецца 120 год з дня нараджэння кс. Мечыслава.

**12 чэрвеня ў 18.00 адбудзецца святая Імша з урачыстым благаслаўленнем абраза кс. Багаткевіча. Усіх католікаў і жыхароў нашага горада сардэчна запрашаю.**

**Ксёндз Аляксандр ГРЫЦКЕВІЧ,**
**пробашч Парафіі Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі ў Верхнядзвінску.**